Брно, 15 лістапада 2020 г.

# Папярэдні план дзейнасці Амбасады незалежнай беларускай культуры ў Чэшскай Рэспубліцы ў сезоне 2020/2021

• Рэгулярнае інфармаванне аб важных падзеях, датычных беларускай культуры і грамадства для чэшскіх СМІ.

• Вядзенне профілю амбасады ў сацыяльных сетках. Умацаванне кантактаў з Каардынацыйнай Радай, беларускімі СМІ, культурнымі ўстановамі ці ініцыятывамі і актывістамі ў самой Беларусі і за мяжой.

• Арганізацыя кіна/відэа/фотапраекцый, сустрэч, дыскусій, прэзентацый, тэматычных экскурсій на базе сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў Чэхіі, клубаў, суполак і да т.п.

• Арганізацыя фотавыставаў: пра беларускія пратэсты – у грамадскай прасторы (Мараўская плошча ў Брне, вандроўная па розных гарадах); Belarus Press Photo у адной з пражскіх галерэй; да ўгодкаў Чарнобыльскай катастрофы.

• Дзень Беларусі – чацвер 25. сакавіка. Пачатак серыі круглых сталоў пра Беларусь і яе далучанасць да Еўропы з удзелам чэшскіх (сярэднееўрапейскіх) і беларускіх інтэлектуалаў. / Тэматычная экскурсія “Слядамі знакамітых беларусаў” у Празе. / Уключэнне беларускага фільму ў праграму Чэшскага тэлебачання. / Жывая бібліятэка. / Іншае.

• Падрыхтоўка мастацкіх тэкстаў (апавяданні, эсэ, вершы) для радыёэфіраў (станцыя “Vltava”). Уключэнне беларускіх мастацкіх тэкстаў у правядзенне “Ночы літаратуры”.

• Лабіраванне беларускіх падборак у літаратурных часопісах.

• Перамовы наконт творчых стыпендый у Чэхіі для беларускіх творцаў.

• Да 17 лістапада і пазней – арганізацыя напісання прыватных лістоў палітычным вязням у Беларусі (звярнуцца да 10 значных асобаў чэшскай культуры і грамадства).

• Пасярэдніцтва пры наладжванні рэгіянальных кантактаў у Чэхіі і Беларусі паміж культурнымі і адукацыйнымі ўстановамі з мэтай пашырэння інфармацыі і далейшага супрацоўніцтва.

• Дапамога пры правядзенні выставы аб беларускай спадчыне UNESCO.

• Складанне базы тэкстаў беларускіх п’есаў, перакладзеных на чэшскую мову, з мэтай іх далейшага выкарыстання пры сцэнічных чытаннях, пастаноўках і да т.п.

• Скантактаваць беларускіх музыкаў з іх калегамі ў Чэхіі і арганізатарамі музычных імпрэзаў з мэтай удзелу беларусаў у канцэртах і фестывалях у Чэхіі.